Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 43 (485)

Сугучча

НА МОВЕ ПАЭЗІІ

Увесь санетарый Янкі Купалы сабралі пад адной вокладкай на 16 розных мовах, прычым некаторыя пераклады былі зробленыя адмыслова для зборніка і апублікаваныя ўпершыню. Кніга, створаная з ініцыятывы Дзяржаўнага літаратурнага музея народнага паэта Беларусі, так і называецца — «Янка Купала. Санеты». Яна ўбачыла свет сёлета ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», а днямі была прэзентаваная для грамадскасці.

Удзел у імпрэзе ўзялі дыпламаты краін, на мовы якіх перакладзены санеты песняра, — Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Славакіі Ёзаф Мігаш, першы сакратар пасольства Украіны Іван Башняк і трэці сакратар пасольства Расійскай Федэрацыі ў Беларусі Марыя Данец, а таксама перакладчык беларускага паэта на кітайскую Лі Цзо. Дзякуючы Цэнтру нацыянальных культур і філфаку БДУ госці прэзентацыі пачулі вершы на армянскай, украінскай, літоўскай, татарскай, грузінскай, сербскай, славацкай, рускай — і, натуральна, на беларускай мове.

Фота kupala-museum.by.

Дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена Ляшковіч, якая разам з міністрам інфармацыі Аляксандрам Карлюкевічам выступіла складальнікам зборніка, нагадала: упершыню 22 купалаўскія санеты на мове арыгіналу і ў перакладзе на 7 еўрапейскіх моў былі прадстаўленыя ў адным зборніку 17 гадоў таму, калі шырока адзначалася 120-годдзе з дня нараджэння паэта. Цяпер геаграфія перакладаў істотна пашырылася, а на рускай і іспанскай санеты загучалі наноў у пералажэннях Максіма Замшава і Анхелы Эспіносы Руіс. «Новыя пераклады сведчаць пра жывую цікавасць да беларускай класікі ў свеце, пра той няспынны творчы пошук паразумення, калі мова мастацкага твора дзякуючы рупліўцам-перакладчыкам становіцца пачаткам сяброўскага дыялогу паміж народамі і краінамі», — упэўнены ўкладальнікі выдання.

Убачыць, пагартаць, а таксама набыць яго можна ў музеі, прычым варта паспяшацца, бо тыраж зборніка, зазначым, абмежаваны — усяго 250 паасобнікаў.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК.

Тэатр

З ЧАГО ПАЧАЎСЯ ЧАЛАВЕК?

Валянцін Елізар'еў прадстаўляе новую рэдакцыю балета «Стварэнне свету»

...Прэм'ера балета «Стварэнне свету» адбылася ў Мінску ў 1976 годзе — біблейская гісторыя цудам, няйначай, пераадолела заслону цэнзуры. Акурат для гэтай пастаноўкі кампазітар Андрэй Пятроў стварыў асобную музычную рэдакцыю і дапісваў некаторыя фрагменты. Спектакль з аншлагам праходзіў не толькі ў Савецкім Саюзе: падчас гастроляў у Польшчы да балетмайстра Валянціна Елізар'ева падышоў з віншаваннямі асаблівы глядач — кардынал Караль Вайтыла, які сказаў: «Дзякуй вам за Бога». Гэтыя словы будучага Папы Рымскага Іаана Паўла II беларускі харэограф захоўвае ў памяці да сёння.

Легендарны спектакль не пакідае падмосткаў айчыннага тэатра оперы і балета ўжо больш за сорак гадоў, але з цягам часу харэограф і пастаноўшчык, народны артыст СССР і Беларусі Валянцін Елізар'еў, які летась вярнуўся ў тэатр як мастацкі кіраўнік, упэўніўся: новы час патрабуе не толькі новых касцюмаў і дэкарацый, але і перагляду тэхнічных рашэнняў, музычнага суправаджэння, харэаграфіі. «Сучаснага чалавека заўжды будзе хваляваць тэма, закранутая ў спектаклі, — перакананы Валянцін Мікалаевіч, — бо Бог стварыў чалавецтва, а ўжо яно, у сваю чаргу, стварае той свет, у якім павінна жыць надзея і існаваць гармонія... Але я разумею, што ставіць спектакль у тым выглядзе, у якім ён існаваў дзесяцігоддзі, мне ўжо нецікава. Дый у тэатры ўжо змяніліся пакаленні артыстаў — вось ад іх індывідуальнасцяў і творчых магчымасцяў я адштурхоўваўся ў новай аўтарскай рэдакцыі, каб глыбей раскрыць тэму чалавека і чалавецтва ў цэлым».

Дарэчы, гэта ўжо чацвёртая класічная пастаноўка, якую аднавілі ў Вялікім за апошнія некалькі гадоў — раней былі «Спартак», «Кармэн-сюіта» і «Рамэа і Джульета». Прэм'ера новай аўтарскай рэдакцыі спектакля «Стварэнне свету» адбудзецца ўжо ў нядзелю, 8 снежня, наступныя паказы прызначаны на 10 і 19 снежня.

Вікторыя ЗАХАРАВА.

Падзея

НА СТЫКУ ТЭХНІК І МАТЭРЫЯЛАЎ

Гэтага чакалі тры гады, а творы дэманструюцца толькі 10 дзён

Праўда, з размахам: у Палацы мастацтва праходзіць IV Беларуская трыенале сучаснага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.

У мастакоў ёсць не толькі фарбы! Мастацкія творы могуць быць выраблены з металу, нітак, тканін, скуры, шкла... Ды і наогул усе магчымыя матэрыялы могуць спалучацца паміж сабой, утвараючы неверагодную кампазіцыю, што здольная не проста аздабляць прастору (у сэнсе дэкарыраваць), а напаўняць яе думкай ці вобразам. Сутнасцю. Пазначаючы прысутнасць чалавека ў свеце. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва, што паказвае сучасная Беларусь, здолела здзейсніць неверагоднае. Яно і традыцыю захоўвае, але і, адштурхоўваючыся ад яе, дае волю фантазіі — сягае ў марах ці не да касмічных вышынь, спрабуючы пераадольваць прасторы.

Не, безумоўна, гэта ўсё цікава найперш тут і цяпер. А шмат якія творы наогул просяцца ў хату на сцяну, асабліва ў халады — габелены, напрыклад. Дый ліхтарыкі каляровыя абяцаюць больш святла ў кароткі дзень. Мастацкае шкло зачароўвае простасцю, але ў той жа час напоўненасцю формаў — вось пад такія вазы і кветкі не патрэбныя.

Таццяна Макляцова-Якаўлева. «Белы шум» (сетка, папера).

Фота Ларысы ЦІМОШЫК.

Формы могуць згадвацца, быць невідавочнымі, але праз іх аўтары нібыта загадваюць нам шараду. Ці наогул гуляюць у хованкі — варта прайсціся між розных плоскасцяў, якія падзяляюць прастору, каб адчуць яе бясконцыя магчымасці ды не згубіцца...

Дэкаратыўна-прыкладному мастацтву трэба прастора — і яму яе далі. Палац мастацтва захоплены творцамі, якія бачаць у традыцыі глебу для развіцця наватарскіх пошукаў. Для іх эксперымент каштоўны тым, што дапамагае традыцыйным тэхнікам жыць і развівацца. У гэтым арганічным суіснаванні — вялікая мудрасць: тут няма супярэчнасцяў, а ёсць узаемадапаўненне. Адсюль і агульнае ўражанне: мастацтва шмат, і яно грэе, стварае атмасферу, гарманізуе прастору. Вось і **старшыня Саюза мастакоў Рыгор СІТНІЦА** не хаваў захаплення ад работ творцаў, што працуюць у гэтым кірунку: «Вы тыя, хто мяне заўсёды радуе, заўсёды і здзіўляе». **Старшыня секцыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Саюза мастакоў, куратар выставак Ірына КУЗНЯЦОВА** пагадзілася: экспазіцыя атрымалася прыгожая.

Натуральна, што тэрмін у тры гады (як праводзіцца трыенале) дазваляе назапасіць твораў і выбраць сапраўды найлепшыя, па-майстэрску створаныя і неардынарныя, сярод якіх ёсць адмысловыя арт-аб'екты, інсталяцыі. У той жа час асобным міні-сусветам у межах вялікай экспазіцыі з'яўляецца выстаўка міні-тэкстылю, у якой бяруць удзел і майстры з Украіны.

— Трыенале мы арганізавалі як свята дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і мастацкага тэкстылю. Гэтая вялікая выстаўка — паказчык стану кірунку на сённяшні дзень. Радуе, што майстры ў актыўным пошуку, уключаюцца новыя матэрыялы, можна бачыць новыя мастацкія рашэнні, — адзначае **кіраўнік секцыі мастацкага тэкстылю, куратар выстаўкі Вольга РЭДНІКІНА.** — І тэкстыль не стаіць на месцы. Добра бачыць, як працуюць маладыя мастакі, таму што натхняцца можна як у сваіх сталых калег, так і ў моладзі. Вельмі даўно ў нас не было асобных праектаў па міні-тэкстылі. Але ў Еўропе гэта даволі папулярны кірунак, біенале тэкстылю праходзяць рэгулярна. Мы спадзяёмся, што таксама выйдзем на двухгадовы цыкл і ўключымся ў міжнародны рух, што аб'ядновае творцаў, якія працуюць у гэтай тэхніцы. Асабіста мяне радуе, што можна пабачыць шырокі спектр мастацкіх рашэнняў. Міні-тэкстыль — удзячная глеба для апрабацыі новых матэрыялаў: дазваляе гэта зрабіць мабільна, а ў такім фармаце можна хутка адчуць нечаканыя рашэнні. Таму патрэбныя рэгулярныя выстаўкі.

Сёння ўжо не трэба даказваць, што дэкаратыўна-прыкладное мастацтва — самадастатковы кірунак, такі ж, як і станковы жывапіс, напрыклад, ці графіка. Хоць і былі часы, калі гэта разумелі не ўсе нават у творчым асяродку, а ў тым жа Палацы мастацтва для ДПМ была адведзена асобная зала. Цяпер залы мала, і справа зусім не ў колькасці...

— Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва больш складанае паводле сваёй мовы — яна больш абагульненая, не прамая, — адзначае **мастацтвазнаўца Ларыса ФІНКЕЛЬШТЕЙН.** — І ў творцаў гэтага кірунку заўсёды быў больш шырокі погляд, яны існавалі не ў сваіх жывапісных ці скульптурных келлях, а ў вялікай прасторы інтэр'ераў, розных — на стыку — тэхнік і матэрыялаў. Сённяшняя выстаўка — вялікая карціна гісторыі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якое ў нас знаходзіцца цяпер на самым піку: ні ў якім іншым мастацтве не робіцца столькі эксперыментаў. Гэта візітоўка беларускага мастацтва, тое, што з гонарам можа прадстаўляць сваю краіну.

І краіна павінна пра гэта ведаць, бачыць, разумець.

Ларыса ЦІМОШЫК.

Гран-пры трыенале дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва прысуджана Святлане Баранкоўскай, Таццяне Макляцовай-Якаўлевай (праект «Белы шум»).

У намінацыі **«Захаванне традыцый»** адзначаны:

За работу з керамікай, шклом, металам і ў іншых тэхніках — Тамара Васюк (1-е месца), Таццяна Малышава (2-е месца), Фаіна Хамініч (3-е месца).

За работы, выкананыя ў тэхніках габелену, ткацтва, роспісу па тканіне і іншых тэхніках мастацкага тэкстылю — Ала Непачаловіч (1-е месца), Галіна Крываблоцкая (2-е месца), Наталля Лісоўская (3-е месца).

У намінацыі **«Наватарства»**:

Найлепшыя работы, выкананыя ў тэхніках керамікі, шкла, металу, дрэва ды іншых стварылі Мікалай Кузьміч (1-е месца), Вольга Сазыкіна (2-е месца), Жанна Марозава (3-е месца).

Адпаведна ў тэхніках габелену, ткацтва, роспіс па тканіне, вышыўцы ды іншых тэхніках мастацкага тэкстылю месцы размеркаваліся такім чынам: Вольга Рэднікіна, Алена Обадава, Настасся Арайс.

У намінацыі **«Інсталяцыя»** пераможцамі сталі Таццяна Козік, Ірына Кузняцова, Хрысціна Высоцкая.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.